**Анатоль Дзмітрыевіч Басянкоў – дырэктар ААТ "Дубровенскі льнозавод". Ураджэнец Дубровенскага раёна.**



Нарадзіўся 19 жніўня 1948 г. у горадзе Дуброўна. Вучыўся ў сярэдняй школе № 1 г. Дуброўна.

Атрымаўшы атэстат аб сярэдняй адукацыі ўладкаваўся на работу на дубровенскі ўчастак Аршанскага раёна электрасетак, працаваў старшым інжынерам, завочна вучыўся ў Беларускім інстытуце электрыфікацыі і механізацыі сельскай гаспадаркі.

З 1974 г. працаваў інструктарам РК КПБ.

У 1978 г. перайшоў на пасаду дырэктара льнозавода.

Прынятыя Басянковым А.Д. арганізацыйныя і практычныя меры забяспечылі стабілізацыю працы прадпрыемства. У 1998 г. ільнозавод, першым у Рэспубліцы Беларусь, пачаў вырошчваць лён уласнымі сіламі на арандаваных землях сельскагаспадарчых прадпрыемстваў раёна. Гэты вопыт знайшоў прымяненне іншымі заводамі рэспублікі. У 2007 г. на льнозаводзе была ўстаноўлена і запушчана ў работу новая бельгійская лінія па перапрацоўцы лёну, прадукцыйнасць якой у 2 разы больш, чым прадукцыйнасць старой расійскай лініі.



ААТ "Дубровенскі льнозавод"

З мэтай забяспечанасці сыравінай, эфектыўнага выкарыстання магутнасцей прадпрыемства і павышэння яго ролі ў вырошчванні лёну ў 2009 годзе павялічаны пасяўныя плошчы гэтай культуры.

Кіраўнік завода вялікую ўвагу надае працэсам механізацыі вырошчвання і ўборкі лёну, набыцці новай айчыннай і імпартнай тэхнікі, новых гатункаў чэшскай, французскай і галандскай селекцыі.

Дзякуючы прымяненню перадавых тэхналогій, вытворчасць ільновалакна павялічваецца. На прадпрыемстве вядзецца далейшая праца па паглыбленай перапрацоўцы льносыравіны. Механізаваны атрад льнозавода аказвае дапамогу с/г прадпрыемствам раёна ў апрацоўцы глебы, вырошчванні і ўборцы лёну, нарыхтоўцы кармоў.

Пад кіраўніцтвам Анатоля Дзмітрыевіча ў 2009 годзе ААТ «Дубровенскі льнозавод» прызнаны пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва сярод ільнозаводаў па вытворчасці і перапрацоўцы лёну.

У 2010 г. прысвоена ганаровае званне "Чалавек года Віцебшчыны".

Ганаровы грамадзянін г. Дуброўна з 2014 г.

**Аляксей Якаўлевіч Гаўруцікаў – адказны сакратар Дубровенскага раённага савета Беларускага грамадскага аб’яднання ветэранаў.**





Нарадзіўся ў жніўні 1942 года ў вёсцы Чубакова, Дубровенскага раёна.

У 1972 г. скончыў Кіеўскае ваенна-марское палітычнае вучылішча, з сакавіка 1982 г. па снежань 1984 г. выконваў інтэрнацыянальны абавязак у Эфіопіі, правінцыя Эрытрэя. Кадравы ваеннаслужачы.

Са студзеня 1999 г. з'яўляецца адказным сакратаром Дубровенскага раённага савета ветэранаў.

Больш за дваццаць гадоў на грамадскіх пачатках займаецца пошукавай працай. Працуючы ў архівах Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, на Інтэрнэт-сайце «ОБД Мемарыял», вызначыў больш за 17 тысяч раней невядомых прозвішчаў салдат і афіцэраў, якія загінулі пры вызваленні Дубровенскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Звесткі аб 24 тысячах загінулых воінах аформіў дакументальна, правёў інвентарызацыю 28 воінскіх пахаванняў, размешчаных на тэрыторыі раёна.

Гаўруцікаў А.Я. прымае актыўны ўдзел у семінарах, прысвечаных пошукавай працы, падтрымлівае цесную сувязь з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, сем’ямі загінулых воінаў.

З'яўляецца актыўным членам клуба ветэранаў «Сардэчныя сустрэчы» і ўдзельнікам міні-праекта «Дом без адзіноты».

Аляксей Якаўлевіч - член рэдкалегіі і складальнік 2-х томнай кнігі-хронікі "Памяць. Дубровенскі раён», аўтар гістарычных звестак аб 250 населеных пунктах раёна і храналогіі Дубровеншчыны са старажытных часоў да нашых дзён. У 2010 годзе стаў аўтарам буклета «Дарогамі Вялікай Перамогі». З'яўляецца пазаштатным карэспандэнтам раённай газеты «Дняпроўская праўда», ім напісана больш за 80 артыкулаў па гісторыі раёна і іншых тэмах.

За ўклад у развіццё ветэранскага руху ў раёне, у патрыятычнае выхаванне моладзі і пошукавую працу Аляксей Якаўлевіч неаднаразова быў узнагароджаны Ганаровымі граматамі Дубровенскага раённага выканаўчага камітэта, Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, Ганаровай граматай Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Дзяржаўнага Сходу Рэспублікі Мардовія, Каардынацыйнага Савета Міжнароднага саюза «Садружнасць грамадскіх арганізацый ветэранаў незалежных дзяржаў», Міжнароднай асацыяцыі грамадскіх пошукавых аб'яднанняў, медалямі "За бездакорную службу ва Узброеных Сілах СССР» I, II, III ступеняў. У ліпені 2014 г. Гаўруцікаву А.Я. прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Дубровенскага раёна». У 2015 г. прысвоена ганаровае званне “Чалавек года Віцебшчыны”.

**Міхаіл Аляксандравіч Ляшчынскі – былы старшыня Дубровенскага раённага выканаўчага камітэту. Старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама.**







Нарадзіўся ў вёсцы Новыя Шарабаі, Глыбокскага раёна Віцебскай вобласці.

У 1971 г. скончыў Гродненскі сельска-гаспадарчы інстытут, у 1989 г. – Мінскую Вышэйшую партыйную школу.

Працаваў аграномам у Лепельскім раёне Віцебскай вобласці.

З 1974 па 1975 гг. з'яўляўся слухачом шасцімесячных курсаў падрыхтоўкі кіруючых кадраў пры БІМСГ, г. Мінск.

Потым працаваў старшынёй калгаса імя Дзімітрава Лепельскага раёна, з 1980 па 1983 гг. – намеснік старшыні, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Лепельскага райвыканкама Віцебскай вобласці.

З 1986 г. быў слухачом Мінскай вышэйшай партыйнай школы.

З 1987 г. – старшыня выканкама Дубровенскага раённага Савета дэпутатаў.

З 1991 г. – старшыня Дубровенскага раённага Савета дэпутатаў.

З 1994 г. – старшыня Дубровенскага раённага выканаўчага камітэту. Унёс значны ўклад у эканамічнае і сацыяльнае развіццё раёна, адраджэнне гістарычнай памяці і традыцый Дубровеншчыны. З'яўляўся старшынёй камісіі па стварэнню 2-х томнай гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць. Дубровенскі раён".

З 2005 г. – старшыня камітэту па працы і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама.

З 2007 г. старшыня камітэту па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама.

З 2014 г. намеснік старшыні Віцебскага абласнога савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

За працоўныя поспехі ўзнагароджаны: у 1980 годзе медалём "За працоўную адзнаку", у 2004 г. – ордэнам Пашаны.

Ганаровы грамадзянін г. Дуброўна з 2014 г.

**Уладзімір Еўдакімавіч Малчанаў – былы дырэктар УП "Дубровенскае ПМС", "Заслужаны меліяратар Рэспублікі Беларусь".**



Нарадзіўся ў жніўні 1941 г. ў горадзе Дуброўна. Скончыў школу. Спачатку працаваў у раённай сельгастэхніцы. У 1959 г. стаў курсантам Друйскага тэхвучылішча № 11, якое скончыў у 1960 г. і набыў спецыяльнасць машыніста экскаватара.

Тры гады працаваў у райсельгастэхніцы машыністам экскаватара, у асноўным займаўся пракладкай асушальных каналаў. У 1963 г. стаў студэнтам гідрамеліярацыйнага факультэта Белсельгасакадэміі. Летам 1968 г. прыехаў па размеркаванні ў Высокаўскую ПМК-38, якая вяла асушэнне зямель у трох раёнах (Аршанскім, Дубровенскім і Талачынскім) і мела тры вытворчыя ўчасткі. Уладзіміра Малчанава накіравалі на працу на Дубровенскі ўчастак на пасаду прараба.

У 1971 г. яго прызначылі на пасаду галоўнага інжынера Высокаўскай ПМК-38. У пачатку 1974 года, калі было прынята рашэнне аб стварэнні новай меліярацыйнай арганізацыі — Дубровенскай ПМК-39, Малчанава У.Е. прызначылі яе кіраўніком, на той момант яму было 32 гады.




Прынятыя ім неабходныя арганізацыйныя і практычныя меры дазволілі стварыць новую арганізацыю. На прадпрыемстве былі пабудаваны рамонтная майстэрня, цэнтральны склад, адміністрацыйны будынак, аўтазаправачная станцыя, піларама, створаны абменны пункт запасных частак. Таксама пабудаваны сталовая, кацельня, гаражы для аўтатранспарту. Вялікая ўвага надавалася будаўніцтву жылля. Пабудавана 296 аднакватэрных жылых дамоў агульнай плошчай 14660 квадратных метраў, шматкватэрны жылы дом на 36 кватэр і інтэрнат на 50 месцаў. Дзякуючы прафесійным навыкам Уладзіміра Еўдакімавіча за 37 гадоў працы прадпрыемствам асушана 31278 гектараў зямель, пабудавана 264,5 кіламетраў дарог, 8 сажалак, выкладзена 15716 кіламетраў дрэнажу, працягласць каналаў склала 542,5 кіламетра, пабудавана 42 масты, 653 трубапераезды.

У цяперашні час прадпрыемства, акрамя абслугоўвання і рамонту ўсіх пабудаваных меліярацыйных сетак і гідратэхнічных збудаванняў, выконвае новыя віды работ: будаўніцтва інжынерных сетак, добраўпарадкаванне тэрыторый, будаўніцтва торфаучасткаў, лясных дарог.

У 70-80-я гг. калектыў меліяратараў быў адзін з самых вялікіх у раёне (каля 300 чалавек).

За доўгія гады плённай працы Уладзімір Еўдакімавіч узнагароджваўся шматлікімі Ганаровымі граматамі і дыпломамі, яму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны меліяратар Рэспублікі Беларусь". У 2012 г. атрымаў званне "Чалавек года Віцебшчыны".

Ганаровы грамадзянін г. Дуброўна з 2014 г.

**Мікалай Васільевіч Мартынаў - беларускі прадпрымальнік, заснавальнік, уладальнік і генеральны дырэктар СТАА «Марка», «Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь», з 2004 года член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**



Нарадзіўся ў в. Гудава Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці.

У 1991 г. скончыў інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання КПБ.

У 1978 г. пачаў працаваць памочнікам майстра Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі "КІМ". У 1990 г. заняў пасаду эксперта камерцыйнага аддзела сумеснага беларуска-германскага прадпрыемства "Белвест".



У 1991 г. заснаваў кампанію "ЛМ + МК", у 1994 г. перайменавана ў "Марка". У кампаніі займае пасаду генеральнага дырэктара.

З'яўляецца членам Савета Рэспублікі, савета па развіцці прадпрымальніцтва, старшынёй Віцебскай абласной асацыяцыі наймальнікаў і прадпрымальнікаў, сапраўдны член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій.

Узнагароды: "Лепшы прадпрымальнік Рэспублікі Беларусь у сферы вытворчасці" (1997), "Лепшы прадпрымальнік Віцебскай вобласці" (1997-1999), "Лепшы прадпрымальнік-арганізатар працоўных месцаў" (2001), "Лепшы прадпрымальнік-падаткаплатнік" (2001).

Жанаты. Мае сына і дачку. Сын Павел Мартынаў, дырэктар «Сан-Марка». Дачка Мартынава Раіса Мікалаеўна, намеснік генеральнага дырэктара СТАА «Марка». Малодшы брат Віктар Мартынаў, мэнэджэр у кампаніі, былы дэпутат Віцебскага гарсавета.

СТАА “Марка” з’яўляецца актыўным спонсарам Міжнароднага фестывалю песні і музыкі “Дняпроўскія галасы ў Дуброўне”.

Ганаровы грамадзянін г. Дуброўна з 2014 г.

**Маргарыта Мікалаеўна Турава - беларуская лёгкаатлетка, выступае ў спартыўнай хадзе, віцэ-чэмпіёнка свету 2005 года і чэмпіёнка Еўропы 2006 года.**

Нарадзілася ў горадзе Дуброўна ў 1980 г. З дзяцінства займалася ў спартыўнай секцыі лёгкай атлетыкі пры сярэдняй школе № 1 г. Дуброўна ў Вольгі і Юрыя Максакоў.

Пасля заканчэння школы працягвала вучобу ў Мінскім вучылішчы алімпійскага рэзерву. У 2001 г. на чэмпіянаце свету сярод юніёраў у Рызе па спартыўнай хадзе на 5 км. заняла 3-е месца.

На юнацкім першынстве Еўропы па спартыўнай хадзе на 20 км. заняла 2-е месца.

Дасягненні:

Алімпійскія гульні 2004 г. – 4-е месца;

Пераможца Кубка Свету – 2006 г.;

Сярэбраная медалістка чэмпіянату Сусвету – 2005 г.;

Пераможцы серыі Гран-пры – 2005 г.;

Чэмпіёнка Беларусі – 2006 г.;

Ганаровы грамадзянін горада Дуброўна з 2015 г.






